**Запрашаем маладых людзей на службу!**

Свіслацкі аддзел Дэпартамента аховы прапануе маладым людзям ва ўзросце да 28 гадоў выбраць годную і пачэсную прафесію праваахоўніка і далучыцца да дружнага калектыву аддзела.

Вас чакае цікавая і адказная служба па ахове грамадскага парадку, асабістай і дзяржаўнай уласнасці, папярэджанне і своечасовае раскрыццё злачынстваў, забеспячэнне бяспекі людзей, абарона іх правоў і законных інтарэсаў.

У нас ёсць вакансіі міліцыянера ўзвода міліцыі, міліцыянера-вадзіцеля групы затрымання ўзвода міліцыі, міліцыянера-кінолага групы затрымання ўзвода міліцыі.

Пры адборы ўлічваюцца маральныя і дзелавыя якасці, стан здароўя, узровень адукацыі кандыдатаў. Сярод абавязковых патрабаванняў: наяўнасць сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі, а таксама служба ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь. Кандыдат можа атрымаць адмову за тое, што прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці.

Для праваахоўнікаў дзяржавай прадугледжаны сацыяльныя льготы і гарантыі. Сярод іх – абавязковае дзяржаўнае страхаванне за кошт рэспубліканскага бюджэта ці іншых прадугледжаных заканадаўствам крыніц. Супрацоўнікі з ліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоваў маюць права на льготны крэдыт на будаўніцтва, рэканструкцыю або пакупку жылля. Іх дзецям гарантуецца прадастаўленне месцаў у дзіцячых садках на працягу трох месяцаў з дня падачы заявы. Супрацоўнікі органаў унутраных спраў і члены іх сем’яў маюць права на медыцынскае абслугоўванне ў арганізацыях аховы здароўя органаў унутраных спраў, санаторна-курортнае лячэнне, іншыя меры сацыяльнай абароны, прадугледжаныя заканадаўствам. Праваахоўнікі могуць разлічваць на першачарговае права па забеспячэнні жылымі памяшканнямі камерцыйнага карыстання камунальнага жылога фонду. Прадастаўляецца водпуск з захаваннем грашовага забеспячэння для здачы ўступных іспытаў пры паступленні ва ўстановы сярэднеспецыяльнай і вышэйшай адукацыі, пры атрыманні адукацыі пасля ВНУ, дадатковай адукацыі. Супрацоўнікі, якія праслужылі па кантракце не менш за пяць гадоў (за выключэннем перыядаў навучання ў стацыянары пры атрыманні адукацыі), маюць права на аднаразовую грашовую дапамогу пры

заключэнні другога кантракта і наступных або пры падаўжэнні яго на новы тэрмін у памерах: 10 базавых акладаў – пры заключэнні (падаўжэнні) кантракта ад 3 да 5 гадоў, 35 базавых акладаў – пры заключэнні кантракта на пяць і больш гадоў.

Падрабязную інфармацыю наконт паступлення на службу можна атрымаць па адрасе: г. Свіслач, перавулак Першамайскі, 1. Тэлефоны для даведак: (801513) 3-33-43, (8029)764-99-67.

Валерый АЛІФЕРОВІЧ, начальнік Свіслацкага аддзела Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь